# Лесвічны гусенічны пад'ёмнік для інвалідаў

Інваліды-калясачнікі нярэдка маюць цяжкасці з перамяшчэннем. Сур'ёзнай перашкодай з'яўляюцца для іх лесвічныя маршы шматпавярховых дамоў, якія не маюць ліфта. Такі бар'ер, на які звычайны чалавек нават не зверне ўвагі, не дазваляе калясачнікам выйсці на вуліцу самастойна і патрабуе сур'ёзных фізічных намаганняў з боку, калі з'явіцца ў гэтым неабходнасць.





Для паляпшэння якасці жыцця людзей з абмежаванымі магчымасцямі ў Ашмянскім раёне ў рамках падпраграмы «Безбар'ернае асяроддзе жыццядзейнасці інвалідаў і фізічна аслабленых асоб» Дзяржаўнай праграмы аб сацыяльнай абароне і садзейнічанні занятасці насельніцтва ў Гродзенскай вобласці на 2016-2020 гады набыты лесвічны гусенічны пад'ёмнік для інвалідаў. Прылада пад'ёмніка адрозніваецца прастатой і зручнасцю ў выкарыстанні і захоўванні і, вядома ж, дапамагае спусціцца на калясцы па лесвічных маршах.

Любы інвалід-калясачнік, а гэта 105 дарослых і 7 дзяцей, якія пражываюць у нашым раёне, можа скарыстацца гэтым абсталяваннем: узяць яго на час у пракат - калі ёсць чалавек, які дапаможа інваліду, або папрасіць у цэнтры паслугу суправаджэння ад месца пражывання да пункта прызначэння і назад.

**Дадзеныя віды паслуг інвалідам-калясачнікам аказваюцца ў ТЦСАН бясплатна.**

**Звяртацца за аказаннем паслуг неабходна па тэл. 70977, 76626 або па адрасе: г. Ашмяны, вул. Заходняя, 11.**